# РАЗВІЦЦЁ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ НА ЎРОКАХ МОВЫ Ў 5-8 КЛАСАЎ

**М. А. Грынчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 1 г. Смаргоні

На старонках “Настаўніцкай газеты” мне давялося прачытаць такія цікавыя радкі “ Настаўнік, я люблю цябе не за тое, хто ты, а за тое, хто я, калі я з табой”.

Напэўна, на сучасным этапе не патрэбны проста настаўнікі- прадметнікі, а патрэбны настаўнікі-прафесіяналы, якія могуць стварыць умовы для ўключэння вучня ў самастойную пазнавальную дзейнасць, сфарміраваць індывідуальны стыль пазнання, стымуляваць вучня да дасягнення пастаўленай мэты, забяспечыць эмацыянальную падтрымку, стварыць сітуацыю поспеху.

З першых дзён работы ў школе заўважыла, што многія вучні абыякава адносяцца да роднай мовы, чамусьці лічаць яе непатрэбным прадметам. Стараюцца вывучаць толькі дзеля добрай адзнакі на экзаменах і на цэнтралізаваным тэсціраванні. Стала вельмі крыўдна і балюча за нашу мову.

Як жа ажывіць урок, павысіць яго эфектыўнасць, як актывізаваць працу школьнікаў, падтрымаць іх цікавасць да прадмета. Па крупінках збірала найлепшыя здабыткі перадавой педагагічнай навукі і практыкі. Але гэтыя ідэі, знаходкі заўсёды імкнулася выкарыстоўваць творча, з улікам спецыфікі прадмета, індывідуальных асаблівасцей сваіх выхаванцаў.

Адной з асноўных задач сучаснай школы з’яўляецца падрыхтоўка чалавека, які можа самастойна прымаць рашэнні і эфектыўна, разумна дзейнічаць у разнастайных жыццёвых сітуацыях. Кожнае дзіця па-свойму таленавітае, толькі патрэбна яго падтрымаць і дапамагчы раскрыцца.

Зрабіць вучобу радасцю – вось дэвіз маёй педагагічнай дзейнасці. Па-сапраўднаму творча працаваць можна тады, калі адукацыйны працэс прыносіць задавальненне.

На сённяшні дзень, на жаль, пазнавальная актыўнасць навучэнцаў развіта слаба, адсутнічае цікавасць да вывучэння прадмета, а адзнака выступае як галоўны стымул і асноўны вынік вучобы. Урок ператвараецца ў накапленне ведаў па тэорыі мовы, а развіццё іх уяўлення, мыслення, іх асобы, творчых здольнасцей застаюцца на другім плане. Узнікае пытанне: як дапамагчы вучню вывучаць беларускую мову з жаданнем? Чым зацікавіць, як павысіць пазнавальную актыўнасць?

Я стала выкарыстоўваць у вучэбнай дзейнасці творчыя заданні, якія не толькі развіваюць пазнавальную актыўнасць, але спрыяюць развіццю мыслення вучняў, узбагачаюць іх слоўнікавы запас і служаць сродкам фарміравання ведаў, уменняў, навыкаў. Таму эпіграфам маёй працы сталі радкі:

З адзінаю на кожны ўрок
Іду жаданай мэтай:
Што гэта будзе новы крок
Пазнання вучнем свету.

З вопыту ведаю, чым больш вучні заняты творчым працэсам, насычаным рознымі відамі дзейнасці, тым вышэй ўзровень актыўнасці кожнага з іх: яны перажываюць свае няўдачы і памылкі і прыкладаюць намаганні, каб дабіцца станоўчых вынікаў. У сувязі з гэтым мне хацелася знайсці эфектыўныя метады і прыёмы для развіцця творчай асобы вучня.

Мэтай педагагічнай дзейнасці з'яўляецца развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў праз выкарыстанне творчых заданняў, накіраваных на актывізацыю дзейнасці вучняў, фарміраванне ў іх творчых здольнасцей, устойлівай цікавасці да прадмета.

У нас шмат таленавітых дзяцей, якім трэба дапамагчы раскрыць свае творчыя здольнасці. Таму мая роля як настаўніка-філолага вельмі вялікая, бо развіццё творчых здольнасцей садзейнічае фарміраванню духоўна багатай, рознабакова развітой асобы.

Галоўная роля ў развіцці пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў належыць, безумоўна, настаўніку, прафесійныя намаганні якога накіраваны на пошукі дзейсных метадаў і прыёмаў гэтай работы. На дадзеную акалічнасць звяртае асаблівую ўвагу І.Ф.Харламаў, які падкрэслівае, што «навучанне ёсць мэтанакіраваны педагагічны працэс арганізацыі і стымулявання актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў па авалодванні навуковымі ведамі, уменнямі і навыкамі, развіццю творчых здольнасцей, светапогляду і маральна-эстэтычных поглядаў і перакананняў». Праблема цікавасці да вывучэння прадмета звязваецца з нестандартнасцю падыходу да зместу і арганізацыі вывучэння прадмета, якая вядзе да актывізацыі мысліцельнай дзейнасці навучэнцаў. Нестандартнасць работы, творчыя заданні дапамагаюць абудзіць эмоцыі радасці і здзіўлення ў працэсе дзейнасці, атрымаць задавальненне ад атрыманых вынікаў работы.

Творчасць – норма дзіцячага развіцця, схільнасць да творчасці ўласціва ўвогуле любому дзіцяці. Аднак, прымаючы ўдзел у творчай дзейнасці, чалавек можа дзейнічаць, кіруючыся вызначаным узорам (пасіўна-пераймальная дзейнасць), можа з многіх прапанаваных варыянтаў рашэння самастойна выбраць адзін (актыўна-пераймальная) і, нарэшце, ён можа прыдумаць, стварыць якасна новае (творчая дзейнасць). Кожны вучань на вызначаным этапе здольны да якога-небудзь з гэтых тыпаў дзейнасці ў большай ці меншай ступені. І гэта павінен улічваць настаўнік, прапаноўваючы творчыя заданні на ўроку.

Падчас працы над заданнямі вучні змогуць замацаваць і паглыбіць веды па прыграме, даведацца пра адметнасць і асаблівасці Беларусі, яе гісторыі, жывёльнага свету, развіваць камунікатыўныя навыкі.

Творчымі з'яўляюцца любыя заданні, калі ў рабоце над іх выкананнем вучань не толькі выяўляе свае тэарэтычныя веды (расстаўляе знакі прыпынку, вызначае граматычныя катэгорыі), але і праяўляе свае здольнасці, паказвае свае адносіны да апісваемай з'явы, выяўляе сваё адчуванне слова. Навучыць гэтаму кожнага вучня класа – мая задача. І вельмі важна, каб усе цягнуліся да творчасці. Таму нават у слабенькай рабоце я імкнуся знайсці нешта станоўчае, цікавае, звярнуць на гэту знаходку ўвагу аднакласнікаў. Гэта будзе тая іскрынка, на якую ўмела дзьмухаючы, можна запаліць у душы вучня агеньчык творчасці, сачыць, каб ён не згас, а разгараўся. Такую працу я пачала не з вялікіх тэм, а з мініяцюрных замалёвак. А такія работы (сачыненні-мініяцюры), на якія трацім не ўвесь урок, а нейкую яго частку, я праводжу часта.

Гэта можа быць дыялог на прапанаваную настаўнікам ці выбраную вучнем тэму (“У бібліятэцы”, “Пасля канікул”, “Дзядулевы казкі”).

Калі пішуць дыялог, трэба, каб абавязкова праверылі яго на слых, прачыталі па асобах.

Сачыненнем-мініяцюрай можа быць партрэт чалавека, пейзажная замалёўка, апісанне нейкага жыццёвага факта, здарэння.(“Зімні лес”, “Бяроза пад акном”, “Кацяня Восені”).

Цікавая, але турботная работа – сачыненне па прыказцы ці прымаўцы. Пачынаем гэту працу ў 5 класе. Прапаную напісаць невялічкае сачыненне, загалоўкам якога павінна стаць прыказка ці прымаўка. Вучні ахвотна ўключаюцца ў работу. Не баюся звярнуцца па дапамогу да класа:

- Кажуць, адна галава добра, а дзве яшчэ лепш. У нас жа вунь колькі галоў у класе. І якіх, разумных, дапытлівых, кемлівых. Падумайце, якія яшчэ можна прапанаваць тэмы для сачынення-мініяцюры.

Такой прапановай раблю вучняў удзельнікамі пошукаў у творчасці, пазнавальнай актыўнасці, а не проста выканаўцамі загадаў, патрабаванняў, волі настаўніка.

Са свайго вопыту ведаю: мініяцюрныя замалёўкі – прыдатны матэрыял для таго, каб абудзіць цягу да пазнавальнай актыўнасці, літаратурнай творчасці ў кожнага вучня.

Даволі пашыраным відам творчых работ, якія практыкуюцца на ўроках мовы, з'яўляецца сачыненне па карціне. Матэрыялам на гэтых уроках выступае разнастайная выяўленчая прадукцыя. У апошні час усе падручнікі мовы для 5-8 класаў даюць не толькі каляровыя рэпрадукцыі карцін мастакоў або фотаздымкі, але і пэўныя ўказанні (як пісаць, на што звярнуць увагу), пералічваюць патрабаванні да самога сачынення-апісання.

Я практыкую сачыненні па індывідуальным малюнку: кожны вучань атрымлівае малюнак (часцей за ўсё паштоўку), піша па ім сачыненне. Заданні даюцца простыя: знайсці адпаведныя зместу малюнка назоўнікі, выпісаць гэтыя назоўнікі ў два, тры, чатыры слупкі (па ліках, адушаўлёнасці, родах, скланеннях, асновах). Паступова заданні ўскладняюцца, даходзім да напісання сачыненняў. Адбор вяду з улікам спецыфікі тэмы, праграмных патрабаванняў. Напрыклад, у 7 класе (тэма "Прыслоўе") праграма прапаноўвае напісаць сачыненне-апісанне знешняга выгляду чалавека па карціне. Падбіраю самыя яркія, запамінальныя, характэрныя паштоўкі з камплектаў (напрыклад, "Нацыянальныя касцюмы").

Каб разгарэўся касцёр, трэба ў яго падкладваць дровы, сухое ламачча. Каб не завяла пакаёвая расліна, яе трэба паліваць. Каб не згасала пазнавальная актыўнасць, трэба пастаянна шукаць новыя тэмы ці новыя аспекты ў развіцці моўнай творчасці.

Вучням падабаюцца заданні арыгінальныя, нестандартныя, таму што аднастайныя заданні з падручніка прыгнечваюць і надакучаюць. Выконваючы прапанаваныя заданні творчага характару, навучэнцы неаднаразова чытаюць і прагаворваюць словы (слоўнікавыя, на выбраную арфаграму), што садзейнічае запамінанню іх правапісу з апорай на зрокавую, слыхавую памяць. Напрыклад, дамашняе заданне: прыдумаць загадкі, адгадкамі на якія будуць словы з фіналіямі –аль, -ар (якія заканчваюцца на –ум, -ус; з першай часткай іншамоўных асноў і г.д).

Значнае месца на сваіх уроках адводжу творчай самастойнай рабоце. Такая праца павышае цікавасць дзяцей да навучання, развівае назіральнасць, вучыць самастойнасці. А самае важнае, што ў творчых пісьмовых работах праяўляюцца індывідуальныя якасці і асаблівасці іх мовы.

Для гэтага прапаноўваю вучням наступныя заданні:

-складанне міні-тэкст з выкарыстаннем вывучаных слоў (запазычаных, нескланяльных, на вывучаныя арфаграмы і г.д);

-заданні на ўменне дапасоўваць словы ў сказе (напішы як мага больш сказаў, у якіх словы пачынаюцца з дадзеных літар);

-складанне сказаў з фразеалагізмамі;

-творчыя дыктанты, дыктанты з працягам.

Прапаную вучням у якасці дамашняга задання дапісаць двухрадкоўе ці чатырохрадкоўе і растлумачыць арфаграмы або выкарыстаць вызначаную арфаграму, часціну мовы, пунктаграму; скласці рэкламу. Пры выкананні такіх заданняў навучэнцы дэманструюць і арыгінальнасць мыслення, і пачуццё рытму і рыфмы, удасканальваюць арфаграфічныя навыкі.

Урокі роднай мовы, напэўна, як ніякія іншыя, адкрываюць перад навучэнцамі магчымасці для актывізацыі пазнавальнай актыўнасці, развіцця творчых здольнасцей. Гэтаму садзейнічаюць не толькі асноўныя віды творчых работ на ўроках (сачыненні, пераказы, пераклады, водгукі, вуснае слоўнае маляванне ), а і цікавыя формы правядзення ўрокаў, займальныя творчыя заданні. Да вучняў неабходна данесці, што ў творчасці няма канца, што кожнае нестандартнае рашэнне – гэта рашэнне цікавае і важнае. І, канечне, настаўніку неабходна заахвочваць творчыя ідэі і вынікі творчай дзейнасці, стымуляваць далейшае развіццё, тады і для вучня будзе цікавым прадмет і з'явіцца жаданне навучыцца большаму, навучыцца якасна.

Падтрымцы пазнавальнай цікавасці і актыўнасці, развіццю творчага мыслення спрыяе і займальны матэрыял. Часта выкарыстоўваю на ўроках заданні з кніг В.І.Паўлоўскай "Мова: цікава і займальна", В.Д.Старычонка "Займальная філалогія", А.В.Солахава "Займальны матэрыял па беларускай мове", В.М. Туркевіч "Творчасці зярняты залатыя…", І.Шпадарука "У свеце слоў, з'яў і фактаў", У.Юрэвіча "Слова жывое, роднае, гаваркое", з часопісаў "Роднае слова" і "Беларуская мова і літаратура"

Галоўны вынік на сённяшні дзень – гэта павышэнне пазнавальнай актыўнасці вучняў да вывучэння роднай мовы, фарміраванне ўстойлівай цікавасці да прадмета. Дзеці, натхнёныя вынікамі сваёй працы, яшчэ больш стараюцца, імкнуцца і надалей атрымліваць перамогі, адчуваюць задавальненне ад сваёй працы. З задавальненнем ідуць на ўрокі роднай мовы.

Назіранні за развіццём пазнавальнай актыўнасці паказалі, што цікавасць да чытання беларускіх твораў значна ўзрасла.

Такім чынам, на сучасным этапе мэтанакіраванае, творчае развіццё вучняў – адна з галоўных мэт навучання. Эфектыўным спосабам развіцця пазнавальнай актыўнасці з'яўляюцца творчыя заданні, якія трэба выконваць не эпізадычна, а планамерна. У працэсе творчай дзейнасці ў навучэнцаў выхоўваецца самастойнасць, павышаецца цікавасць да вывучаемага прадмета, фарміруецца ўменне разважаць, творча мысліць, бо, як адзначае А.А.Лявонцьеў, "працэс навучання – гэта працэс дзейнасці вучня, накіраваны на станаўленне яго свядомасці і яго асобы ўвогуле".

Усялякую справу можна ўдасканальваць і развіваць бясконца. Каб развіць у вучняў пазнавальную актыўнасць, неабходна абудзіць цікавасць да творчасці, развіць уменне адчуваць прыгажосць роднага слова. Мая асноўная задача – развіццё асобы дзіцяці праз слова і творчасць. З дзіцяці вырасце творчая асоба толькі тады, калі мы, настаўнікі, будзем падтрымліваць натхненне вучняў не толькі падчас урокаў, але і ў пазакласнай рабоце.

Працуючы на ўроках, вучні чакаюць незвычайных заданняў. Выканаўшы іх, радуюцца сваім новым дасягненням, адкрыццям, творчым поспехам.

Я заўважыла, што выкарыстанне заданняў творчага характару садзейнічае актыўнаму ўдзелу вучняў у пазнавальным працэссе, а ўрокі беларускай мовы сталі для навучэнцаў больш цікавымі.

Здавалася б, пастаўленая мэта дасягнута, накоплены пэўны вопыт работы, і цяпер можна працаваць у рамках выбранай стратэгіі. Але лічу, што працэс удасканальвання бясконцы, пэўны этап, маленькая прыступка да развіцця пазнавальнай актыўнасці, фарміравання асобы духоўна багатай і ўсебакова развітой, чалавека актыўнага і творчага.